# Мемарыяльная дошка Герою Савецкага Саюза Жданаву Паўлу Ільічу

*(адкрыта ў ліпені 2004 года ў г.п.Зэльва на доме №10 па вуліцы Перамогі)*




Мемарыяльная дошка Герою Савецкага Саюза П.І. Жданаву ўстаноўлена 2 ліпеня 2004 года на доме, дзе ён жыў з 1980 па 1986 год.

За баявыя заслугі ў час Вялікай Айчыннай вайны падпалкоўнік Жданаў быў узнагароджаны не толькі зоркай героя, але і ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава III ступені, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі, граматамі. У пасляваенны час працаваў брыгадзірам саўгаса ў Горкаўскай вобласці, а затым старшынёй калгасаў у Навагрудскім і Зэльвенскім раёнах.

У гады вайны П.І. Жданаў знаходзіўся на Заходнім і Бранскім франтах на пасадзе ваеннага камісара, у 1942 г. быў камандзірам 310-га стралковага палка 13-й арміі. Удзельнічаў у бітве на Курскай дузе, вызваленні Арлоўскай вобласці. Вызначыўся пры фарсіраванні р. Дзясны, якую воіны яго палка пераадолелі на двух участках, і р. Днепр на поўнач ад Кіева.



За гераізм і мужнасць, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра 16 кастрычніка 1943 года яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Адрас: Гродзенская вобласць, Зэльвенскі раён, г.п. Зэльва, 2004 г.**

## Бібліяграфія:

1. Броска, Т. П. З гісторыі населеных пунктаў / Т. П. Броска // Памяць. Зэльвенскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск : Паліграфафармленне, 2003. — С. 282—283.

2. Книга героев Гродненской области / сост. Ю. М. Алексей, О. М. Якубович. — Гродно: ГОУПП “Гродн. тип.”, 2004. — С. 29.

3. Коломиец, В. Р. Герой Советского союза Павел Ильич Жданов / В. Р. Коломиец // Славуты Зэльвенскі край: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (Зэльва, 12 снеж. 1998 г.) / Рэдкал.: Д. С. Аляшкевіч (гал. рэд.) і інш. — Ліда: ГАУПП “Лідская друкарня”, 2004. — С. 279—280.

4. Маўклівыя сведкі ваеннай пары: краязнаўчы інтэрнэт-праект [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://moygorod-zelva.jimdo.com/. — Дата обращения: 11.04.2019.

5. Павел Жданов – неизвестные факты из жизни Героя Советского Союза // Праца. — 2018. — 19 октября. — С. 3.

6. Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. Т. 4. Гродненская область. В 2 кн. Кн. 1. / редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. — Минск: Беларуская Энцыклапедыя Імя П. Броўкі, 2014. — С. 323.

7. Хільмановіч, В. А. Памяць, увекавечаная ў помніках і абелісках / Вольга Хільмановіч // Славуты Зэльвенскі край: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (Зэльва, 12 снеж. 1998 г.) / Рэдкал.: Д. С. Аляшкевіч (гал. рэд.) і інш. — Ліда: ГАУПП “Лідская друкарня”, 2004. — С. 256.